Фарміраванне грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей
у навучэнцаў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі
сродкамі каляндарна-абрадавай дзейнасці

1. **Інфармацыйны блок.**

Назва тэмы. Фарміраванне грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей у навучэнцаў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі сродкамі каляндарна-абрадавай дзейнасці.

Актуальнасць вопыту. У сучасных умовах адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца маральнае і патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, стварэнне выхаваўчай прасторы, арыентаванай на засваенне навучэнцамі агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, ідэалогіі беларускай дзяржавы, культурных і духоўных традыцый беларускага народа. Выхаванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі - адна з галоўных задач, канчатковай мэтай якой павінна стаць фарміраванне асобы грамадзяніна, патрыёта, працаўніка, сем'яніна. У сувязі з гэтым дадзены накірунак выступае як патрабаванне дзяржаўнай важнасці, накіраванае на фарміраванне грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей навучэнцаў.

Нягледзячы на тое, што тэма грамадзянска-патрыятычнага выхавання прапісана ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Канцэпцыі і Праграме бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2021-2025 гады, ўсё ж такі работа з навучэнцамі ў гэтым накірунку патрабуе ад нас, педагогаў, пошуку новых формаў, метадаў і прыёмаў, каб развіваць і фарміраваць у дзяцей грамадзянска-патрыятычныя каштоўнасці.

Згодна з Канцэпцыяй бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2021-2025 гг., грамадзянскасць – інтэгратыўная якасць асобы, арыентаваная на годнае, адказнае і сацыяльна значнае выкананне сацыяльных роляў. Патрыятызм - сістэма ведаў, каштоўнасцей, практычных дзеянняў асобы, грамадства і дзяржавы, накіраваных на развіццё, росквіт і забеспячэнне нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь; светапоглядная падстава і глыбокае пачуццё любові да

сваёй Айчыны, гатоўнасць абараняць яе [3, с. 12]. Але, каб фарміраваць у дзяцей грамадзянскасць і патрыятызм, неабходна арыентаваць іх на засваенне агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, культурных, духоўных традыцый беларускага народа [3, с. 13].

У працэсе фарміравання грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей вельмі важны ўлік узроставых асаблівасцей. У навучэнцаў малодшага школьнага ўзросту педагогі фарміруюць уяўленне пра чалавека як пра галоўную каштоўнасць грамадства, даюць ім пачатковыя звесткі пра Канстытуцыю, правы чалавека і дзіцяці.

Важную ролю адыгрывае і фарміраванне паняцця пра сваю малую радзіму (горад, вуліца, школа), сям'ю, свой радавод, а таксама навучанне дзяцей культуры зносін. Вялікае значэнне мае таксама фарміраванне ўяўлення пра гістарычнае мінулае Радзімы, абуджэнне цікавасці да малой радзімы, прывіццё павагі да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа [3, с. 13].

Зыходзячы з вышэй сказанага, фарміруем праблему: як жа ў дзяцей малодшага школьнага ўзросту сфарміраваць такія важныя каштоўнасці, неабходныя для кожнага адказнага грамадзяніна?

Практыка работы ў школе паказала, што ў большай ступені менавіта народная, фальклорная музыка выхоўвае актыўную жыццёвую пазіцыю сучаснага маладога чалавека, дае яму высокія арыенціры ў жыцці.

Дасягненне эмацыйна-пачуццёвага ўспрымання і разумення народных твораў лічыцца асновай набыцця такіх якасцей, як высакароднасць, прыстойнасць, здольнасць асобы любіць маці, Радзіму, працу.

На вучэбных занятках дзеці знаёмяцца з музычнымі традыцыямі народаў свету, культурнай спадчынай краін Блізкага і Далёкага замежжа, музычнай культурай Беларусі і г.д. На жаль, абмежаванасць вучэбных гадзін па прадмеце «Музыка» (адна гадзіна ў тыдзень на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі) не дазваляюць у поўнай меры прывіць навучэнцам любоў да народных традыцый, каляндарна-абрадавых святаў, народнай музыкі. Адсюль і зніжэнне цікавасці да фальклорнай музыкі, спадчыны нашых продкаў. Каб зразумець усю сутнасць,

глыбіню народнай музыкі, мала аднаго знаёмства ў выглядзе праслухоўвання музычнага матэрыялу, развучвання народнай песні, неабходна выконваць, «ужывацца» ў песню, карагод, у само свята. Толькі тады можна палюбіць народную спадчыну, калі можна цалкам у яе пагрузіцца.

Асаблівую папулярнасць у нашай установе адукацыі набылі культурна-масавыя мерапрыемствы, якія асабліва падабаюцца вучням пачатковых класаў. Яны з радасцю прымаюць удзел у канцэртах, каляндарна-абрадавых святах, выступленнях перад бацькамі, гасцямі. І калі педагогі могуць удасканальваць атрыманыя вучнямі веды на вучэбных занятках у сістэме дадатковай адукацыі і пазашкольнай дзейнасці, то можна сцвярджаць, што школа ў гэтым накірунку дасць трывалыя ўменні і навыкі дзецям.

Такім чынам, праблема фарміравання грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей на ўроках музыкі і ў пазаўрочнай дзейнасці на сённяшні дзень вельмі актуальная і з'яўляецца агульнай мэтай масавай музычнай адукацыі.

**Мэта:** стварэнне ўмоў для фарміравання ў вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей з дапамогай арганізацыі і правядзення каляндарна-абрадавых святаў, звязаных з народным календаром, сезоннымі святамі, пагружэннем іх у фальклорную музыку.

**Задачы:**

1) прааналізаваць веды навучэнцаў аб фальклорнай музыцы, каляндарна-абрадавых святах;

2) развіць у дзяцей матывацыю да пазнання народнай музыкі праз назапашванне ведаў аб каляндарна-абрадавых святах;

3) навучыць дзяцей выконваць каляндарна-абрадавыя песні, танцы, гульні, выкарыстоўваючы асаблівасці народнай музыкі;

4) навучыць дзяцей адчуваць і любіць родную зямлю, родную прыроду, ганарыцца веліччу сваёй краіны сродкамі каляндарна-абрадавай дзейнасці.

Работу над сваім педагагічным вопытам я пачала ў 2015 годзе, калі прыйшла працаваць намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце і настаўнікам музыкі ў школу, размешчаную ў сельскай мясцовасці. Няведанне дзецьмі

народных песень, гульняў, святаў, неразуменне беларускай мовы мяне моцна здзівіла. Тым больш, што наша зямля, асабліва Лебедзеўская, дзе я цяпер працую, вельмі багатая на музычную спадчыну. І тады я вырашыла, што неабходна зацікавіць навучэнцаў фальклорнай музыкай сродкамі каляндарна-абрадавай дзейнасці.

**2. Апісанне сутнасці вопыту.**

Вядучая ідэя вопыту заключаецца ў стварэнні мадэлі ўрока музыкі для 4 класа, якая будзе дапамагаць арганізоўваць і праводзіць каляндарна-абрадавыя святы з мэтай развіцця грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей.

У самім слове фальклор, якое ў перакладзе з англійскай (folk-lore) азначае «народная мудрасць», заключана яго асноўнае значэнне. Беларускі фальклор – гэта нашы карані, наша гісторыя, наша памяць, душа нашага народа. Народная творчасць дае ўяўленні пра жыццё і побыт, пра змены ў мове, уяўленне аб нацыянальных традыцыях і звычаях. Паданні, казкі, прыказкі, песні, прыпеўкі, найгрышы, батлейкі, прыкладное мастацтва – сапраўдная народная мудрасць.

Адметная асаблівасць фальклору – гэта адсутнасць аўтара, калектыўная творчасць. Усе творы шматразова змяняліся, шліфаваліся дзесяцігоддзямі, нават стагоддзямі, перадаючыся ад майстра да майстра з пакалення ў пакаленне. Другая асаблівасць – адсутнасць дакладнай даты стварэння, бо ў народнай творчасці адлюстроўваецца ўсё жыццё, і ў адной рэчы можна знайсці прыкметы розных часоў. Акрамя таго, фальклорныя творы маюць велізарнае мноства варыянтаў, бо фальклор як рака, якая збірае ў сябе шмат ручайкоў.

Каляндарна-абрадавыя песні – гэта від вуснага абрадавага фальклору, які звязаны з класічнымі рытуаламі і звычаямі. Каляндарна-абрадавыя песні адносяцца да старажытнага віду народнай творчасці і атрымалі сваю назву з-за сувязі з народным сельскагаспадарчым календаром – распарадкам работ па порах года.

Сур'ёзная прафесійная кампазітарская цікавасць да нацыянальнага фальклору з’вілася ў пачатку XIX стагоддзя. Нельга не ўспомніць імя піяніста і кампазітара Антона Абрамовіча, які ўпершыню ў гісторыі беларускай музыкі

выкарыстаў у сваіх творах песенны і танцавальны беларускі фальклор. Абрадавыя песні і танцы ўключаны ў яго фартэпіянную паэму «Беларускае вяселле». У ёй імітуецца гучанне народных інструментаў, выкарыстоўваюцца характэрныя рытмічныя і гарманічныя абароты. Беларускі каларыт прасочваецца таксама ў яго сюіце «Шэсць часоў года».

Класік беларускай і польскай музыкі кампазітар Станіслаў Манюшка ў сваіх творах таксама абапіраўся на народную творчасць. Так, у зборнік рамансаў «Хатні песеннік» увайшлі песні на вершы беларускага паэта Я.Чачота, у якіх ярка праяўляюцца рысы беларускай народнай музыкі.

Збіральнікам беларускага фальклору быў скрыпач і кампазітар Міхаіл Ельскі. Многія з народных мелодый пазней былі выкарыстаны ў яго інструментальных творах.

Лепшыя творы сучаснага мастацтва маюць карані ў фальклоры. Ідэі і сюжэты чэрпалі з народнай творчасці вядомыя беларускія паэты і пісьменнікі Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч. На беларускім фальклоры заснаваныя музычныя творы М. Чуркіна, М. Аладава, Я. Цікоцкага і іншых беларускіх кампазітараў. М. Чуркін запісаў больш за тры тысячы народных песень і танцаў. 16 беларускіх народных песень выкарыстана ў яго сімфаніеце «Беларускія карцінкі», якая стала першым нацыянальным сімфанічным творам і якая лічыцца своеасаблівай энцыклапедыяй народнага жыцця.

У сваім вопыце я звяртаюся да праграмнага матэрыялу 4 класа па вучэбным прадмеце «Музыка». Менавіта тут можна падвесці вынікі сваёй працы ў накірунку «Каляндарна-абрадавая музыка». Арыентуючыся на тэму першага ўрока «Музыка – люстэрка жыцця і душа народа», я і пачынаю мэтанакіраваную работу па фарміраванні грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей у навучэнцаў. Для таго, каб зразумець, у якой меры навучэнцы валодаюць ведамі аб каляндарна-абрадавых святах, абрадах, песнях, танцах, гульнях, напярэдадні праводжу невялікую дыягностыку. Згодна з крытэрыямі ўзроўню сфарміраванасці патрыятызму і грамадзянскасці [7, с. 281] у

малодшых школьнікаў, у пачатку навучальнага года праводжу маніторынг сярод навучэнцаў 4 класа (Дадатак 1).

Аналіз вынікаў маніторынгу падцвярджае маё меркаванне, што дзеці, як правіла, не валодаюць ведамі пра народныя святы, а тым больш, пра каляндарна-абрадавую музыку.

Для таго, каб пачаць работу менавіта ў накірунку вывучэння каляндарна-абрадавай музыкі, праводжу папярэднюю работу з класнымі кіраўнікамі, а таксама настаўнікамі-прадметнікамі, якія пазнаёмяць навучэнцаў з гісторыяй узнікнення дадзенага свята, з яго традыцыямі і абрадамі, прыкметамі, прыказкамі і г.д. Таму я прашу настаўнікаў пачатковых класаў асаблівую ўвагу надаць знаёмству з каляндарна-абрадавымі святамі (Дажынкі, Калядкі, Масленіца, Гуканне вясны, Саракі, Купалле) на такіх вучэбных занятках, як «Літаратурнае чытанне», «Чалавек і свет», на класных гадзінах. Толькі тады, калі дзеці ведаюць гісторыю ўзнікнення свята і яго змест, можна смела пачынаць работу па развучванні музычнага матэрыялу.

Наступны крок майго вопыту – размеркаванне музычнага матэрыялу на чатыры цыклы (восеньскі цыкл – урок «Восеньскія песні», свята «Багач», зімовы цыкл – урок «Музыка ў народных абрадах і святах (Каляды)», свята «Каляднік», вясенні цыкл – урок «Музыка ў народных абрадах і святах (Масленіца, Гуканне вясны, Саракі)», свята «Ляльнік» і летні цыкл – урок «Музыка ў народных абрадах і святах (Купалле)», урок-канцэрт «Купалінка».

Выкарыстоўваючы праграмны музычны матэрыял, абавязкова знаёмлю навучэнцаў з народнымі творамі мясцовага значэння. Багатая Лебедзеўская зямля на песенную творчасць, а таксама на каляндарна-абрадавую. Асаблівай папулярнасцю тут карыстаюцца песні-вяснянкі. Вось некаторыя з іх:

*Ты прыйдзі, вясна*

1. Мы вясну чакалі, мы вясну гукалі.

Ты прыйдзі, вясна, ты прыйдзі, вясна - 2 р.

2. З ручайком імклівым, з рэчкай гаманлівай.

Ты прыйдзі, вясна, ты прыйдзі, вясна - 2 р.

3. З песенькай-вяснянкай, з сонейкам уранку

К нам прыйшла вясна, к нам прыйшла вясна – 2 р.

*Свята песняй страчаем*

1. Свята песняй страчаем, вясну-красну гукаем.

Ходзім дружна карагодам, дай нам, сонейка, пагоду – 2 р.

2. Шчасце, долю гукаем, мы зямлю адмыкаем

Хай жа жыцейка лунее, хай жа кветачкі квітнеюць – 2 р.

3. Свята шчыра сустрэлі, птушкі к нам прыляцелі,

Вясну-красну мы гукаем, усіх на свята запрашаем! – 2 р.

*Ой ты, вясна-красна, што ж ты нам прынясла?*

1. Ой ты, вясна-красна, што ж ты нам прынясла?

Адкуль прыйшла, адкуль прыйшла,

Што ж ты нам прынясла? – 2 р.

2. Хлопчыкам – па чаўночку, дзевачкам – па вяночку,

К старым бабкам, к малым дзеткам

Вясна-красна прыйшла – 2 р.

3. Дзевачкам – па вяночку, пастушкам – па кіёчку.

Да нас прыйшла, да нас прыйшла

Наша вясна-красна!

На прыкладзе вучэбнага занятку «Музыка ў народных абрадах і святах (Масленіца, Гуканне вясны, Саракі)» хачу прадставіць мадэль урока з элементамі кейс-тэхналогіі, якая найбольш удала, на мой погляд, раскрывае дадзеную тэму, дапамагае дасягнуць пастаўленай мэты – абагульніць і пасшырыць уяўленні навучэнцаў аб беларускай каляндарна-абрадавай традыцыі (вясновы цыкл) (Дадатак 2).

Аналізуючы ўсё вышэй сказанае, можна вызначыць некалькі этапаў работы па фарміраванні грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей у навучэнцаў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі сродкамі каляндарна-абрадавай дзейнасці:

1 этап – дыягнастычны – этап анкетавання, выяўлення ведаў навучэнцаў аб каляндарна-абрадавых цыклах, музычным «упрыгожанні» свят;

2 этап – пачатковы – этап назапашвання ведаў аб народным свяце;

3 этап – навучальны – этап вывучэння новых песняў , танцаў, карагодаў, гульняў, ігры на музычных інструментах (музычнага матэрыялу) або паўтарэнне раней вывучанага;

4 этап – завяршальны – этап прадстаўлення каляндарна-абрадавага свята (тэматычны ранішнік, урок-канцэрт, вечарына, урок-даследаванне і г.д.).

Выніковасць і эфектыўнасць вопыту.

У канцы навучальнага года (на заканчэнні 4 класа) я зноў праводжу маніторынг сфарміраванасці патрыятызму і грамадзянскасці ў малодшых школьнікаў праз каляндарна-абрадавую музыку паводле пазначаных крытэрыяў: эмацыйна-каштоўнасны, інфармацыйна-пазнавальны, дзейнасна-выніковы [8, с. 281]. Крытэрыі дыягностыкі ўключаюць веды пра каляндарна-абрадавую музыку, асаблівасці беларускай народнай музыкі, выкананне твораў беларускіх аўтараў ці народнай музыкі каляндарна-абрадавага цыкла. Паказчыкі сведчаць аб становчай дынаміцы і паляпшэнні па ўсіх вызначаных параметрах (Дадатак 3).

**Выніковасць і эфектыўнасць.**

Аналізуючы сваю дзейнасць, я прыйшла да высновы, што работа ў дадзеным накірунку дала плённы вынік. Дзеці штогод з задавальненнем удзельнічаюць у традыцыйных каляндарна-абрадавых святах, не баяцца выступаць перад бацькамі і аднавяскоўцамі, аднакласнікамі. Яны добра разумеюць неабходнасць валодання ведамі і ўменнямі, звязанымі з нашай культурнай спадчынай.

Маладзечанскае тэлебачанне трансліравала «Калядкі ў Лебедзева», якое падрыхтавалі навучэнцы 4 класа (Дадатак 4). Прыемнай падзеяй стаў таксама ўдзел у свяце «Гуканне вясны» (Дадатак 5), падрыхтаваным навучэнцамі нашай установы адукацыі сумесна з Лебедзеўскім сельскім домам культуры, якое праходзіла на тэрыторыі парка мясцовага значэння «Парк Маліноўшчына» і

трансліравалася на Беларускім тэлебачанні 3 у перадачы «Наперад у мінулае» 23 красавіка 2017 года.

У сакавіку 2021 года ў рамках метадычнага аб'яднання настаўнікаў музыкі Маладзечанскага раёна я правяла адкрыты ўрок у 4 класе «Музыка ў народных абрадах і святах (Масленіца, Гуканне вясны, Саракі)», мадэль якога прадстаўляю ў дадатках (Дадатак 2).

**3. Заключэнне.**

Звышзадачай вучэбнага прадмета «Музыка» з'яўляецца выяўленне цеснай сувязі музыкі і жыцця (Д. Б. Кабалеўскі). Рашэнне гэтай звышзадачы вельмі ўдала ажыццяўляецца праз выяўленне жыццёвых вытокаў і жыццёвага зместу музыкі. Менавіта арганізацыя і актыўны ўдзел навучэнцаў у каляндарна-абрадавых святах і стала яркім прыкладам прымянення ў рэальным жыцці набытых у працэсе навучання ведаў, уменняў, вопыту музычнай і мастацкай дзейнасці.

Сапраўды, скарбы народнай культуры і мастацтва – незаменны сродак выхавання Чалавека: патрыёта, інтэлектуала, працаўніка, творцы.

Хочацца верыць, што нашы разумныя і таленавітыя дзеці будуць шчаслівымі і ў дарослым жыцці, што часцінка народнай культуры, падораная кожнаму з іх роднай школай, прарасце кветкамі дабрыні і характва.

Якое шчасце быць самім сабой!
Рабіць – што любіш, і любіць – што робіш!
Тым самым адчуваць у душы спакой
За тое, што жыццё сваё не губіш.
Не бавіш час на тое, што пастыла,
Хаця і важнасці таго не адмяніць.
І ўсміхаешся ўсім таму, што адчуваеш –
Як здорава на свеце гэтым жыць!

Тамара МАСКАЛЁВА

(г.п.Акцябрскі, Гомельская вобласць)

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Кодекс Республики Беларусь об образовании: с изм. и доп. по состоянию на 21 сент. 2016 г. – Минск: Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2016. – 400 с.

2. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 гг: Утверждена Постановлением Министерства образования Республики Беларусь: 31 декабря 2020 г., № 312 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2021/03/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf – Дата доступа: 06.04.2021.

3. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи. Утверждена Постановление Министерства образования Республики Беларусь: 15 июля 2015 № 82.

4. Аляхновіч, А. М. Веснавыя святы / А. М. Аляхновіч. – Мінск: Ураджай, 2000. – 254 с.

5. Аляхновіч, А. М. Зімовыя святы / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Ураджай, 1998. – 134 с.

6. Бабчанок, М. А. Беларуская фальклярыстыка: аказіянальныя абрады і паэзія: дапаможнік / М. А. Бабчанок. – Мінск: БДПУ, 2010. – 72 с.

7. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы: зборнік / склад. Янкоўскі Ф. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 493 с.

8. Суменков, И. А. Основные направления гражданско-патриотического воспитания // Социально-гуманитарные тенденции: история и современность [Электронный источник]: сборник статей II-ой Международной научно-практической конференции (16 ноября 2018 г., г. Тюмень). – Западный: Научно-исследовательский центр «АнтроВита», 2018.

Дадатак 1

Характарыстыка ўзроўню сфарміраванасці патрыятызму і грамадзянскасці ў малодшых школьнікаў праз каляндарна-абрадавую музыку

| Крытэрыі, паказчыкі патрыятызму і грамадзянскасці | Характарыстыка ўзроўню патрыятызму і грамадзянскасці | | |
|---|---|---|---|
| | Высокі (аптымальны) | Сярэдні (дастатковы) | Нізкі (недастатковы) |
| Эмацыйна-каштоўнасны | Мае ўяўленне пра музычную культуру беларускага народа; мае ўяўленне аб характэрных асаблівасцях беларускай народнай музыкі; можа выканаць твор беларускага аўтара ці народную песню | Мае ўяўленне пра музычную культуру беларускага народа; мае ўяўленне аб характэрных асаблівасцях беларускай народнай музыкі | Мае ўяўленне пра музычную культуру беларускага народа |
| Інфармацыйна-пазнавальны | Ведае, якую ролю адыгрывае музыка ў жыцці чалавека; можа раскрыць змест праслуханых твораў; можа адрозніць музычныя творы каляндарна-абрадавых свят | Ведае, якую ролю адыгрывае музыка ў жыцці чалавека; можа раскрыць змест праслуханых твораў | Ведае, якую ролю адыгрывае музыка ў жыцці чалавека |
| Дзейнасна-выніковы | Можа выканаць твор каляндарна-абрадавай музыкі; можа ахарактарызаваць твор беларускага аўтара ці народную песню; можа вар'іраваць мелодыі, складаць, імправізаваць | Можа выканаць твор каляндарна-абрадавай музыкі; можа ахарактарызаваць твор беларускага аўтара ці народную песню | Можа ахарактарызаваць твор беларускага аўтара ці народную песню |

Дадатак 2

**4 КЛАС**

**МУЗЫКА**

**Гуляева, А.Р., Прастакова, С.А., Кабачэўская, С.М.**

| **Мэта і задачы** / **Тэма, тып урока** | **Сцэнарый (сюжэт) урока** | **Гульнявыя метады і прыёмы** |
|---|---|---|
| **Тэма ІІ паўгоддзя**<br><br>«Музычныя падарожжы»<br><br>**Урок з элементамі кейс-тэхналогіі**<br><br>**Тэма ўрока**<br><br>«Музыка ў народных обрадах і святах (Масленіца, Гуканне вясны, Саракі)»<br><br>**Мэта ўрока:**<br><br>абагульніць і пасшырыць уяўленні навучэнцаў аб беларускай каляндарна-абрадавай традыцыі (вясновы цыкл)<br><br>***Задачы:***<br><br>1.Пасшырыць уяўленні навучэнцаў аб | 1. **Уваход** навучэнцаў пад б.н.п. «Вясна-красна, падзі сюда!» (*у залежнасці ад прадмета: птушачка, сонейка або лентачка, які выбіраюць навучэнцы, займаюць адпаведнае месца ў адной з трох груп*)<br>2. **Музычнае прывітанне**<br>**Настаўнік**: Добры дзень, дзеці!<br>**Дзеці:** Добры дзень!<br>**Настаўнік**: Я вам вельмі рада!<br>**Дзеці:** І мы рады!<br>**Усе:** Добры дзень, госці!<br>**Госці:** Добры дзень!<br>3. **Гутарка**<br>Дзеці, сёння ў нас на самой справе вельмі добры дзень, цудоўны настой. І я вельмі спадзяюся, што ў канцы ўрока ваш настрой будзе яшчэ лепшы, таму што вы даведаецеся шмат новага, навучыцеся адрозніваць каляндарна-абрадавую музыку, выконваць музычныя творы. Ну што, ў добры шлях?!<br>4. **Вызначэнне тэмы і мэты ўрока** | Музычнае прывітанне |

<table>
<tr>
<td>народных святах «Масленіца», «Гуканне вясны», «Саракі».<br><br>2. Замацаваць уяўленні аб цеснай сувязі музыкі і жыцця.<br><br>3. Фарміраваць уменні вызначаць каляндарна-абрадавую музыку вясенняга цыкла па характэрных прыкметах.<br><br>4. Удасканальванне ўменняў выразных спеваў, рухаў пад музыку, фарміраванне элементарных акцёрскіх і рэжысёрскіх уменняў.<br><br>5. Удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці ў творчай дзейнасці</td>
<td>Калі вы заходзілі ў клас, то чулі прыгожую музыку, звярнулі ўвагу на незвычайна ўпрыгожаны кабінет. Скажыце, калі ласка, а якія асацыяцыі, якія словы паўстаюць у вашым уяўленні? (вясна, птушкі, свята, песня). Што ж аб’ядноўвае гэтыя дзействы ў адно цэлае? (вясенняя песня, песня пра вясну, вясеннія птушачкі, прылёт птушак, ажываючыя галінкі, свята). Правільна, і ўсё гэта - вясна (музыка вясны).<br>Усё ў нашым жыцці адбываецца заканамерна (прыказка: гром грыміць – зямля дрыжыць), ў нейкім адпаведным рытме: дзень-ноч, навучанне ў школе-канікулы, поры года таксама не выключэнне. Мы з вамі добра ведаем, што пасля зімы прыйдзе вясна і не можам паўплываць на тое, каб пасля зімы наступіла лета. Давайце ўспомнім, што поры года – гэта цыклы (зімовы, вясновы, летні і восеньскі). Як вы думаеце, пра які цыкл мы сёння з вамі будзем гаварыць? (вясенні цыкл). І мы з вамі сёння будзе гаварыць пра музыку ў народных абрадах і святах.<br>Актуалізацыя ведаў вучняў<br>Абрад - сукупнасць строга акрэсленых дзеянняў, якімі суправаджаецца выкананне рэлігійных рытуалаў або бытавых традыцый.<br><br>Свята - урачысты дзень у гонар або ў памяць якой-небудзь выдатнай падзеі, даты.<br><br><table><tr><td></td><td>Д</td><td>Ы</td><td>Н</td><td>А</td><td>М</td><td>І</td><td>К</td><td>А</td><td></td></tr></table></td>
<td>Метад жыццёвых асацыяцый</td>
</tr>
</table>

<table>
<tr>
<td></td>
<td>
<table>
<tr><td></td><td></td><td></td><td></td><td>Г</td><td>У</td><td>Л</td><td>Ь</td><td>Н</td><td>І</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>К</td><td>А</td><td>З</td><td>К</td><td>І</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>М</td><td>Е</td><td>Л</td><td>О</td><td>Д</td><td>Ы</td><td>Я</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>П</td><td>О</td><td>Л</td><td>Ь</td><td>К</td><td>А</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td></td><td>Л</td><td>А</td><td>Д</td><td></td><td></td><td></td></tr>
</table>
А) СРОДАК МУЗЫЧНАЙ ВЫРАЗНАСЦІ, ЯКІ ЎКАЗВАЕ НА СІЛУ ГУКА (дынаміка)
Б) САМЫ ВЯСЁЛЫ, ЖАРТОЎНЫ НАКІРУНАК У МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ (гульні)
В) СКАРБНІЦА НАРОДНАЙ МУДАСЦІ (казкі)
Г) СРОДАК МУЗЫЧНАЙ ВЫРАЗНАСЦІ, ЯЕ НАЗЫВАЮЦЬ КАРАЛЕВАЙ МУЗЫКІ (мелолодыя)
Д) САМЫ РАСПАЎСЮДЖАНЫ БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ТАНЕЦ (полька)
Е) СРОДАК МУЗЫЧНАЙ ВЫРАЗНАСЦІ, ЯКІ ЎКАЗВАЕ НА ХАРАКТАР МУЗЫКІ (лад)
5. Работа з падручнікам
- Гутарка пра свята «Гуканне вясны»( стар. 114). Абмеркаванне (Прагляд відэароліка «Гуканне вясны на малой радзіме» (абмеркаванне)
Развучванне песні
- Гімнастыка для правільнага дыхання
</td>
<td>
Крыжаванка
Метад музычных абагульненняў
Гімнастыка для правільнага дыхання
</td>
</tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| | - Праслухоўванне песні «**Мы вясну гукаць ідзём**» (абмеркаванне).<br>- Развучванне песні (стар. 115-116).<br><br>6. Работа ў групах па Кейс-тэхналогіі (10 хв.)<br>(*На стале кожнай групы знаходзіцца «кейс»: малюнкі вясновых святаў (Масленіца, Гуканне вясны, Саракі), ноты б.н.танцаў (Лявоніха, Крыжачок, полька-Янка), беларускія прыказкі пра вясну, словы песень (Чаму ж нам не пець, Жавароначкі прыляціце, Усміхаецца вясна, Мы вясну гукаць ідзём ), заданні*.<br>*Кожная група выбірае «**мадэратара**». Мадэратар арганізоўвае работу ў групе. (Роля мадэратара складаецца з адказнасці за арганізацыю работы групы, размеркаванне пытанняў паміж удзельнікамі і за прыняцце рашэнняў). Затым выбіраюць «**сакратара**», які фіксуе вынікі работы, і «**шкіпера**», які прадстаўляе праект на агульнае абмеркаванне (Гуканне вясны, Масленіца, Саракі).*<br>7. Прадстаўленне праектаў.<br>8. Падвядзенне вынікаў. Выкананне музычных твораў, якія адпавядаюць настрою, характару народных святаў вясновага цыкла *(сл. Я.Пушчы, муз. В.Волах «Усміхаецца вясна», б.н.п. «Чаму ж мне не пець», б. н.т. «Полька-Янка»).*<br>9. Рэлакс (*апусташэнне гаршчочкаў, вясновая мініяцюра на дошцы з выбраных навучэнцамі прадметаў у пачатку урока: птушачка, сонейка або стужачка*). | Вакальна-харавая работа<br><br>Кейс-тэхналогія<br><br>Метад музычных абагульненняў<br><br>Карагод «Усміхаецца вясна», пластычнае інтанаванне «Чаму ж мне не пець», шумавы аркестр б. н.т. «Полька-Янка» |

Дадатак 3

Дынаміка ўзроўню
сфарміраванасці патрыятызму і грамадзянскасці
навучэнцаў 4 класа ў 2020/2021 навучальным годзе
праз каляндарна-абрадавую дзейнасць

Параўноўваючы паказчыкі ўзроўню сфарміраванасці патрыятызму і грамадзянскасціў малодшых школьнікаў праз каляндарна-абрадавую дзейнасць на пачатак і канец навучальнага года можна зрабіць выснову, што імкненне да дасягненняў у навучэнцаў ўзрасло. Нізкі ўзровень адсутнічае, колькасць навучэнцаў з высокім узроўнем павялічылася на 30%.






Дадатак 4

Сцэнарый каляндарна-абрадавага свята «Ляльнік»

Свята «**Ляльнік**» – свята ў гонар багіні Вясны, якую завуць Ляля. Гэта свята адзначалася напярэдадні Юр'я **5 мая.** Ва ўяўленнібеларусаў Ляля – гэта маладзенькая, прыгожая, стройная дзяўчына з залатой касою. Да сённяшняга дня захавалася пагаворка адносна прыгожых і стройных дзяўчат: «Прыгожая як Ляля».

На **«Ляльнік»** беларусы ўшаноўвалі сімвал парадку, вясны, росквіту прыроды.

Благаславі, Маці,
Ой, Лада, маці!
Вясну заклікаці,
Лета сустракаці!

---

Дзеці збіраюцца на пляцоўцы, гучыць музыка ***«Вясна-красна к нам у госці прыйшла…»***

Гучыць здравіца ***«Сёння з ранку сонца грала…»***

Дз. Благаславі, Божа,
Вясну загукаці, вясну загукаці,
Зіму замыкаці, зіму замыкаці,
Лецейка сустракаці.

Гучыць песня ***«Дазвольце, людзі…»***

Дз. Усюды, радасць, гамана –
Недзе блізка ўжо Вясна.
Расчыняйце пірагі,
Даставайце, ручнікі.
Хто з вас, дзеці, панясе
Прывітальны хлеб Вясне?
Набліжаецца вясна
Сонечнач, залатая.

Мы цябе, вясна, вітаем,

Прывітальны хлеб нясём!

***Пад час дзеяння дзяўчынкі сцелюць ручнік, на яго становіцца Ляля. Дзеці па чарзе кажуць словы і ставяць печыва.***

1. Пашлі нам, Божа, вясну годную, цёплую ды лагодную.
2. Каб сонейка з дождыкам сябрамі былі, разам жылі.
3. Дай нам, Божа, шчасця і радасці.
4. На лета ціхае, на жыта буйнае.
5. Каб былі вы здаровы як вада і багаты як зямля.
6. Няхай на полі і ў двары будзем мы гаспадары.
7. Да, Божа, вясну з сонцам і дажджамі, а лета з вазамі і капамі.
8. Пашлі, Божа, на збажынку род, на скацінку – плод, людзям – на здароўе.
9. Прыйдзі, вясна, зкветкамі, а восень – з палеткамі.

Ляля: Дары вашы прымаю,
Шчасця і міру жадаю.
Няхай кожны з вас будзе гаспадар дбайны,
І пашле вам Бог год ураджайны!

Дз. Час настаў нам паказаць,
Як умеем танцаваць.
Няхай полька ўдалая
Зачаруе ўсіх вас.
Вельмі любім гэты танец,
Не старэе ён у нас.

***Танец «Полька»***

Дз. Вясна цёпла, на чым прыйшла?

В. На сашочцы, на бароначцы.

Дз. Можа з зімой, млжа з холадам?

В. Я не з зімой, я не з холадам.

***Гучыць песня «Вясна-красна на калочку…»***

Дз. 1. Зіма з летам сустрауаецца,

Зіма ў лецейка ды пытаецца:

2. Што цябе, лецейка, так людзі чакаюць,

А мяне, зімачку, так гоняць, праклінаюць?

3. Бо ты, зімачка, халодная,

А я - лецейка  - лаголнае.

2. Затое я – зімачка, святкую, гуляю,

На працу не ганяю.

3. Ты, зімачка, святкуеш, гуляеш,

На працу не ганяеш, усё паядаеш.

Карабы вытрасаеш, засекі вымятаеш.

Што я – лецейка – у гумно занесла,

Ты, зімачка, усё патрэсла.

А я на працу ззываю, дабро збіраю.

2. Ой, ты, лецейка, людзей марнуеш,

Камарамі кусаеш. На працу ганяеш.

А я – зімачка прахладная,

Да працы не жадная,

Паціхеньку тку, праду, у сундучок кладу.

3. Затое ты, зімачка, грозная,

Грозная ды марозная.

Мяцеліцамі завываеш, страх наганяеш.

А я - лецейка – зялёнае ды вясёлае,

Усё квеценню прыбіраю, песенькі спяваю,

У працы прыспадаю.

1. Так зіма з лецейкам спрачаліся,

   Праўды дабіваліся,

   А праўда тут прастая, яе кожны знае:

   Усякую пару дае на Бог к дабру

***Гучыць песня «Ой, вясна, ой, красна…»***

Дз. Ты, вясна, ты красна,

Што ты нам прынясла?

В. Шаўковую траву на вясну,

Буйное жыта на лета, ядрыцу-грэчку - на восень.

Дз. Ой, вясна, ой, красна,

Дык што ж ты нам вынесла, вынесла?

З кораба вытрасла, вытрасла?

В. Вым вынесла саху, барану,

Ды жыта, пшаніцу, пшаніцу,

Ды цёплую вадзіцу, вадзіцу.

Старым бабкам пасядзенечкі,

Маладзіцам кросенцы ткаці,

А дзецям цяпло, каб гуляці.

Дз. Благаславі, маці, вясну загукаці.

У пору пасеяць і ў пору пажаці.

***Гучыць песня «Благаславі, маці…»***

Дз. Вясну песнямі сустракаем

Усе весела мы гукаем:

Жаваронaчкі, прыляціце,

Цёпла лецейка прынясіце!

***Гучыць песня «Жаваронaчкі, прыляціце…»***

Дадатак 5

Сцэнарый каляндарна-абрадавага свята «Калядн**і**к»

Ці ведаеце вы, для чаго мы тут з вамі сабраліся?

Так, каб развітацца са старым годам і сустрэць Новы. Цяпер толькі навагодняя ноч збірае ўсіх за святочным сталом, а даўней беларусы адзначалі надыход Новага года цэлы тыдзень, які зваўся – **Калядным**.

Вечарамі ў сялянскіх хатах сустракалі калядоўшчыкаў. Госці танцавалі, спявалі песні, жадалі гаспадарам шчасця ў надыходзячым годзе.

Давайце ж і мы свой край павітаем,
І дружна яму пажадаем:
Светлае долі, спеўнае мовы,
Каб жылося і вялося
Ды ўсё добрае збылося!

***Ну а зараз….***

---

Вядучы: Не спі, пані скрыпка,
І бубен прачніся, -
Каляднае свята
Наша прачніся

***Песня «Цудоўныя святы»***

Дзед: Ой, нешта ў нашай хаце горача!

Бабуля: Дык я ж тры дні ў печы паліла, пякла, варыла. Хачу каб калядоўшчыкі зайшлі, нашай хаты не міналі. Сядай куццю есці

***(Дзе д і баба садзяцца за стол , перахрышчваюцца)***

Дзед: ***(стукае ў акно)***
Мароз, мароз, хадзі куццю есці!
Не хочаш?
Ну дык і ў летку не прыходзь, бо пугі схопіш!
А мая ж ты бабулька,
Я – твой дзядулька,
Хоць павалюся, а за табой паганюся!

***(Бабулька уцякае, а дзед гоніцца за ёй. Баба хаваецца за печ)***

Баба: А ці бачыш ты мяне, дзядулька?

Дзед: Не, не бачу!

Баба: Каб жа ты за снапамі, вазамі, стагамі свету не бачыў!

(Дзед хаваецца за стол)

Дзед: А ты мяне ці бачыш, бабулька?

Баба: Не, не бачу!

Дзед: Каб жа ты за гуркамі, буракамі, капустаю свету не бачыла!

Баба: Ой, каб твае словы ды праўдаю сталі!

Прыслухайся, дзед, ці не калядоўшчыкі ідуць?

***Гучыць музыка. З каляднай зоркай, казой ідуць калядоўшчыкі пад песню «Калядачкі»***

***Гучыць песня «А ў нядзелю рана»***

1. А ў нядзелю рана зорка засвяціла.
   Новы год! Новы год!
   Зорка засвяціла.
2. Усячыстая Дзева сына нарадзіла.
   Новы год! Новы год!
   Сына нарадзіла.
3. Сына нарадзіла, у пялёнкі спавіла.
   Новы год! Новы год!
   У пялёнкі спавіла.
4. У пялёнкі спавіла, у яслях палажыла.
   Новы год! Новы год!
   У яслях палажыла.

1-ы: Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!

Старому, малому і Богу святому!

2-і: Добры вечар вам, а ці рады вы нам?

Баба: Мы то рады, ды хто вы такія?

3-і: Мы люд просты, з далёкага краю,

З далёку ідзём, казу вядзём.

4-ы: Казу вядзём, шчасце, радасць нясём!

***Гучыць песня «Неба і зямля»***

1. Неба і зямля, неба і зямля
Радасна спяваюць.
Ангелы свету, ангелы свету
Дзіва абвяшчаюць.
Прыпеў: Хрыстос нарадзіўся, Бог аб'явіўся.
Ангелы спяваюць, пастушкі іграюць,
Дзіва, дзіва абвяшчаюць.
2. У Віфліеме, у Віфліеме
Вясёла навіна:
Чыстая Дзева, Чыстая Дзева
Нарадзіла сына.
Прыпеў:
3. І мы Дзіцятку, і мы Дзіцятку
Богу паклон дайма,
Слава на Ўзвышнях, Слава на Ўзвышнях,
Яму заспявайма!
Прыпеў:

5-ы: Калядкі – добрыя святкі, але мароз пракляты.

6-ы: Калядкі – добрыя святкі, бліны ды аладкі!

УСЕ: добры вечар, з Калядамі вас!

Дзед і баба: Праходзьце, праходзьце!

7-ы: Едуць, едуць калядкі, вязуць бліны і аладкі.
На сівенькім канёчку, на маляваным вазочку.
Добры вечар табе, пане гаспадару!
Радуйся, ой, радуйся, зямля,-
Сын Божый нарадзіўся!
Засцілайце сталы, усе, колькі маеце,

Ды кладзіце калачы, святую пшаніцу.

Ды прыйшлі к нам да тры святы ў госці:

А першае свята – Хрыстова нараджэнне,

А другое свята – святое Васілле,

А трэцяе свята – святое Вадохрышчэ.

8-ы: Ці шырокія сцены, каб нам гасцяваць?

Ці добрая гаспадыня, каб нас частаваць?

Баба: Гаспадыня то добрая, але за што вас частаваць?

З чым вы прыйшлі, калядоўшчыкі?

9-ы: З казой шэраю, з вясёлаю!

10-ы: Ну-ка, каза, стань, расхадзіся,

Пану-гаспадару пакланіся,

Пані-гаспадыні пакланіся.

Каб ласкавая была, каб шчодрая была,

Каб унеслі каўбаску ды кусок сала,

Каб каза весялей стала!

Каза: (рассыпаючы жыта)

Святкуем Калядкі, лавіце зярняткі!

Лавіце рукой, каб добры быў настрой!

Каб моцна грэла сонца – кіну ў аконца!

Майце ўсяго даволі, а бяды ніколі!

Нікога не хвалюйце, а ўсім святло даруйце!

Дзед: Дык няхай яна паскача!

УСЕ: А ну-ка, каза, павярніся, добоым людзям пакланіся!

***Гучыць песня «Козачка» (каза скача і валіцца на падлогу)***

11-ы: Каб каза ўстала, трэба даць ёй кусок сала.

12-ы: А на кожны ражок павесіць піражок!

***(дзед і баба адорваюць казу)***

13-ы: Гаспадарушка, наш бацюшка!

Падаруй гасцей – калядоўшчыкаў.

З клеці рэшатам, з печы – пірагом!

14-ы: Хутчэй дарыце, нас не марыце. Кароткі світкі, памерзлі лыткі.

Баба: Дык за што ж вас частаваць, спачатку трэба паспяваць

***Гучыць песня «А ўчора з вячора»***

1. А ўчора з вячора засвяціла зора,
   А ўчора з вячора засвяціла зора,
   Зора засвяціла.
2. Зора засвяціла, свет узвесяліла,
   Зора засвяціла, свет узвесяліла,
   Свет узвесяліла.
3. Людзі прыбягайце, Хрыста прывітайце,
   Людзі прыбягайце, Хрыста прывітайце,
   Хрыста прывітайце!
4. Свет узвесяліўся, Хрыстос нарадзіўся!
   Свет узвесяліўся, Хрыстос нарадзіўся!
   Хрыстос нарадзіўся!
5. Здаровы бывайце, нам каляду дайце,
   Здаровы бывайце, нам каляду дайце,
   Нам каляду дайце!
6. Здаровы святкуйце, дайце,не шкадуйце,
   Здаровы святкуйце, дайце,не шкадуйце,
   Дайце,не шкадуйце!

15-ы: Я ў цябе, гаспадыня, каўбасу чую!
Дай, цётка, каўбасу, бо я хату разнясу!

16-ы: Дай, цётка, пірог, я пайду за прог!

17-ы: Вазьмі нажа вострага, адрэж сала тоўстага!

Баба: Не, не дам. Малавата спявалі, мала скакалі.

18-ы: Ну-ка, рэзні, гармніст, залатыя пальчыкі,
Каб у скокі пусціліся дзевачкі і мальчыкі!

***Танец «Кадрыль»***

Дзед: Вось дык танцоры, вось, малайцы!

Пасядзіце ў нас, пачастуйцеся!

Усё у нас ёсць – і квас, і каўбаскі!

***(дзед ібаба частуюць калядоўшчыкаў)***

19-ы: Дзякуем, гаспадары, за вашы шчодрыя дары.

Жывіце з раскошай, майце торбу грошай!

20-ы: Збожжа поўны клеці, павагу на свеце,

І ўсяго даволі, а бяды ніколі!

***Гучыць песня «Шчодры вечар»***

1. Ой, над морам, над глыбокім

Стаяў явар тонкі, высокі.

Прыпеў: Шчоды вечар, святы вечар

Усім людзям на здароўе!

2. Доюбры вечар, пан гаспадару

Мы ж твайго двара дай не мінаем.

Прыпеў:

3. Мы ж твайго двара развесяляем

Да з святым Ражаствам дай велічаем!

Прыпеў:

21-ы: Каб прынёс год Новы вам

Дабрабыт і плён!

Многа радасці, веру светлых дзён!

22-і: Няхай вам часценька шанцуе на госці.

Ніхто каб ніколі не меў на вас злосці!

23-і: Дзякуй вам за добры прыём,

А цяпер здаровы бывайце,

Цераз лета і восень зноў нас чакайце!

УСЕ: З Калядою вас, ды з вясёлаю,

З зімачкаю яснаю, з долечкаю шчаснаю!

***Гучыць песня «Калядачкі», калядошчыкі выходзяць***